В результате опроса мы установили, что большинство молодых людей так или иначе используют в повседневной речи и своих переписках заимствованные слова, которые, являясь неотъемлемой частью интернет-общения, употребляются под доминантным влиянием английского языка среди других языков и широко распространены в силу своей краткости, простоты и лаконичности.

Литература

1. Википедия: Список Википедий. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Википедия:Список_Википедий. – Дата доступа: 23.03.2021.
2. Английский язык. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 23.03.2021.

## БЕЛАРУСКАЯ ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ: ТРАДЫЦЫЙНАСЦЬ І СУЧАСНАСЦЬ

**А. П. Кучараў**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік В. А. Казлова

Беларускае традыцыйнае вяселле – унікальны абрад са старанна прадуманымі этапамі і распланаванымі дзеяннямі, кожнае з якіх мела глыбокі сакральны сэнс са старажытных часоў. Яно ўяўляла сабой народны спектакль, дзе не было выпадковых дэталяў; іх асноўнае прызначэнне – несці сямейнае шчасце, пладароддзе і дабрабыт. Вядома, сучаснае вяселле моцна адрозніваецца ад традыцыйнага, але некаторыя элементы выконваюцца і цяпер.

Мэтай нашага даследавання з'явілася дасканалае вывучэнне беларускага традыцыйнага вясельнага абраду з выяўленнем асноўных этапаў і характэрных асаблівасцяў яго правядзення; супастаўленне спрадвечных вясельных традыцый з сучаснымі тэндэнцыямі і канстатацыя захавання рыс традыцыйнасці падчас вясельнай цырымоніі XXI ст. Асноўнымі метадамі паслужылі аналіз пісьмовых і песенных крыніц, абагульненне, назіранне і супастаўленне.

Варта адзначыць, што важнасць такой падзеі ў жыцці чалавека як стварэнне сям'і тлумачыць захаванне шматлікіх прыкмет, стойкасць і жывучасць забабонаў, а таксама прытрымліванне часовых рамак правядзення гэтай святочнай імпрэзы. Так, вяселле не гулялі ў перыяд з 7 па 21 студзеня (у так званыя «крывавыя Вечары»), а таксама ў час пастоў. Аптымальныя тэрміны – ад Хрышчэння да Масленіцы, а лепш – напрыканцы лета і ўвосень, адразу пасля ўборкі ўраджаю.

Звычайна беларускі вясельны абрад праходзіў у тры этапы: давясельны («выглядзіны», «запыты»/«пярэпыты», сватаўство, змовіны), само вяселле і паслявясельны («пярэзвы», «пірагі» і «мядовы месяц»). Кожны з іх пабудаваны на цэлым комплексе рытуальных дзеянняў, якія прыводзяцца ніжэй.

На давясельным этапе бацька жаніха выглядаў прыдатную кандыдатуру і на розных падставах заходзіў у дом да нявесты, каб паназіраць за яе здольнасцямі і ацаніць знешнія дадзеныя. Калі дзяўчына падабалася, то вырашалі адправіць да яе сватоў. На Палессі напярэдадні сватаўства праводзіўся яшчэ адзін давясельны абрад – «запыты» ці «пярэпыты». За некалькі дзён да сватоў у хату да выбранніцы з хлебам і соллю засылалі «скаллю» – старую сваячку, якая павінна была заручыцца згодай маладой і яе сям'і. Калі «пярэпыты» былі ўдалымі, то прызначаўся дзень сватаўства, падчас якога нявеста ўжо не магла адмовіць жаніху: гэта лічылася ганьбай для сям'і.

Сватаўство як ключавы момант у давясельнай падрыхтоўцы праводзілася па сваіх правілах у аўторак, чацвер або суботу, часам без удзелу маладога. Сватацца прыходзілі яго родныя, прыносячы з сабой пачастункі: каравай, мёд, гарэлку. Дзейства пачыналася з жартаўлівага дыялогу паміж сваякамі нявесты і сватамі фразай тыпу «у вас – тавар, у нас – купец» або «кажуць, у вас цялушка добрая, то прадайце». Рашэнне аб адмове або згодзе прымалі бацькі маладой. А затым ужо запрашалі сватоў у хату, дзе пыталіся ў дзяўчыны, ці згодна яна выйсці замуж. Пасля атрымання станоўчага адказу распівалася прынесеная сватамі бутэлька гарэлкі і агаворваўся час «запоін», а таксама памер пасагу дзяўчыны. На «запоінах» (сумеснае застолле будучых сваякоў) вызначаўся дзень заручын, пасля чаго дзяўчына лічылася засватанай. У Беларусі пра яе казалі: «яна запіта» або «заедзена яечняй». У выпадку адмовы сваты маглі забраць усе свае падарункі. Існавала павер'е: калі галоўны сват разаб'е бутэльку гарэлкі аб вароты нязгодлівай дзяўчыны, то яна ніколі не выйдзе замуж.

Змовіны, абрад яднання жаніха і нявесты, – адзін з самых старадаўніх. Айцы будучых мужа і жонкі ў ім не ўдзельнічалі. Абрад здзяйсняўся ў доме або ў двары маладой абавязкова ў прысутнасці абодвух родаў. Сваякі станавіліся адзін насупраць аднаго, а жаніх – насупраць сваёй наканаванай. Сват або брат нявесты прымушалі маладых моцна абняцца, потым тры разы абмотвалі іх ручніком.

Уласна вясельны этап пачынаўся з дзявочніка (развітання з сяброўкамі), які праходзіў у так званую «зборную суботу» перад вяселлем. У гэты дзень сяброўкі плялі вясельны галаўны ўбор нявесты – вянок. Яго стараліся рабіць прыгожым, роўным, круглым і тугім, бо ад гэтага залежыў лёс маладой. У гэтую ж суботу пачыналася выпечка каравая, галоўнага атрыбута беларускага вясельнага абраду. Каравай – гэта «огромная булка от 12 до 20 кг весом, иногда до 1,5 м в диаметре, из пшеничной муки, чаще всего круглой или закруглённой формы, снабжаемая на верхней стороне фигурками и другими украшениями из теста, имеющими специальное символическое и магическое значение» [1, с. 181]. Пры гэтым багатыя сяляне выкарыстоўвалі толькі пшаніцу, а бедныя рабілі з аржаной мукі галоўны бохан, верхнюю частку якога ўпрыгожвалі пшанічнымі фігуркамі (часцей за ўсё сонца, месяца і зорак – старадаўнімі сімваламі сям'і ў славян [2, с. 107]). Матэрыял (у нашым выпадку – абавязкова пшаніца) валодаў чарадзейнай сілай забеспячэння дастатку будучай сям'і. Пяклі каравай і ў хаце жаніха, і ў доме нявесты замужнія жанчыны, і лічылася добрай прыкметай, калі сярод іх была цяжарная. Увесь працэс гатавання суправаджаўся выкананнем каравайных песень з мэтай уміласцівіць багоў, якія апякаюць маладых.

Асаблівы рытуал чакаў жаніха перад тым, як ехаць за нявестай: бацька перавязваў яму рукі даматканым ручніком, тройчы абводзіў вакол стала, пакрытага белым ільняным абрусам, а потым вёў да парога і даваў яму невялікі абраз. Маці благаслаўляла сына ў дарогу. Ікону пакідалі дома; сват браў з сабой грамнічную свечку, каб засцерагчы вясельны картэж. У абавязкі свата ўваходзіў таксама клопат пра грошы і пачастункі, якія патрэбныя былі на выкупе.

Рыхтаванне дзяўчыны да ўрачыстага свята адбывалася пры дапамозе сяброўак, прычым не ў бацькоўскай хаце, а ў доме па тым жа баку вуліцы, дзе жыла сям'я маладой. Нявесце заплятаці касу, канчаткова падганялі сукенку і перавязвалі яе даматканым чырвоным поясам. Вэлюм апраналі ў самы апошні момант.

Выкуп нявесты, якім звычайна кіравалі браты маладой, праходзіў з шумам і жартамі і нагадваў тэатралізаваны кірмаш. Пасля ўдала праведзенай здзелкі жаніх забіраў нявесту і вёў у дом бацькоў.

Наступным этапам вяселля было вянчанне ў храме. Пры ўваходзе маладыя станавіліся на спецыяльны ручнік, пад які клалі чырвоны пояс і два медныя пятакі (ўсё гэта трэба было забраць з сабой). Падчас вянчання нявеста павінна была стаяць злева ад жаніха (каля сэрца). Пасля заканчэння цырымоніі абавязковым было наведванне і пакланенне магілам продкаў.

Лічылася добрым знакам, калі вясельны картэж на сваім шляху праедзе сем мастоў: праз кожны з іх жаніх пераносіў нявесту на руках. Суседзі і аднавяскоўцы стараліся перагарадзіць маладым дарогу сталом, на якім стаялі вядро вады і хлеб-соль. Сваты адкупляліся ад іх гарэлкай і ласункамі. Каля дома маці нявесты ў вывернутым кажусе, валёнках і з хлебам-соллю на руках сустракала маладажонаў. Першы крок яны рабілі не на зямлю, а на покрыва або вывернуты кажух. Паколькі парог у нашых продкаў лічыўся зонай смерці, муж ўносіў жонку ў хату на руках, а госці абсыпалі маладую пару збожжам.

Часцей за ўсё вяселле доўжылася тры дні, прычым радня жаніха і нявесты гуляла асобна. Заканчвалася свята абрадамі дзялення каравая і зняцця фаты. Свякроў здымала з нявесткі вэлюм і перадавала яго старэйшай шаферцы, каб тая хутчэй выйшла замуж. Маладой на галаву павязвалі хустку, а таксама апраналі фартух – сімвалы жаночай долі.

У паслявясельным перыядзе вылучаецца абрад «пярэзвы», абрад запрашэння і частавання гасцей у дамах сваякоў і бацькоў. Напрыканцы застолля ў доме маладой/маладога хто-небудзь са сваякоў (дзядзька-таварыш, хросная маці або старэйшая сяброўка) запрашаў (перазываў) усіх удзельнікаў вяселля разам з музыкамі да сябе ў хату. У гэтым выпадку ў бацькоў маладых бралі толькі гарэлку, а пачастункі выстаўлялі свае. Пярэзвы суправаджаліся наступным рытуалам: узяўшы з вясельнага стала лустачку хлеба (пірага), старэйшы таварыш перазываў запрошаных да сябе ў хату. Пачаставаўшыся, з тым жа кавалкам хлеба яны пераходзілі да другога, трэцяга і г. д. і у рэшце рэшт вярталіся ў дом бацькоў (з той жа лустачкай хлеба). Гасцяванне ў сваякоў маладой называлася сваскія ці дзявочыя пярэзвы, а ў сваякоў маладога – пацанскія пярэзвы.

У першую суботу пасля вяселля праводзілі так званыя «пірагі» – застолле для бацькоў маладых, якія з-за клопатаў не маглі нармальна пасядзець за святочным сталом. Бацькі маладога і іх бліжэйшыя родныя прыязджалі з пірагамі да бацькоў маладой. У дом склікалі шваграў, знаёмых і частаваліся ўсе разам. З гэтага моманту пачынаўся «мядовы месяц», які доўжыўся з дзевятага па саракавы дзень пасля заключэння шлюбу.

Разгледзеўшы прыблізны сцэнар беларускага вяселля ў старажытным варыянце і супаставіўшы яго з сённяшняй сітуацыяй, можна зрабіць выснову, што ў наш час традыцыйны вясельны абрад у чыстым выглядзе ўжо амаль не сустракаецца ў Беларусі, але многія звычаі, хоць і ў змененай форме, захаваліся і выконваюцца дагэтуль. Пералічым элементы традыцыйнасці сучаснай вясельнай цырымоніі: змовіны і знаёмства бацькоў да вяселля; правядзенне дзявочніка і хлапечніка ў давясельны перыяд; прысутнасць павязаных ручнікам сватоў на вяселлі; ўпрыгожванне вясельнага картэжа; вэлюм як абавязковы атрыбут ўбору нявесты; абрад выкупу нявесты – адзін з самых вясёлых і цікавых момантаў вяселля; рэдка – абрад перакрыцця дарогі маладым на шляху ў Палац шлюбу; абмен заручальнымі кольцамі; абсыпанне маладых збожжам, пялёсткамі руж, грашыма і цукеркамі ў знак шчаслівага і забяспечанага жыцця; наведванне мемарыяльных комплексаў, помнікаў і брацкіх магіл; нашэнне нявесты на руках па мосце падчас фотасесіі ў парку; сустрэча караваем, калі жаніх і нявеста падыходзяць да дома або рэстарана; разбіванне куфляў на шчасце; ўнясенне нявесты ў дом на руках; у канцы вяселля – падзел вясельнага тарта як аналага каравая.

У заключнай частцы адзначым, што па шэрагу прычын (развітасць інфармацыйнага грамадства, дэмакратычнасць, раўнапраўе полаў і інш.) у Беларусі пачатку XXI ст. людзі не прытрымліваюцца большай часткі векавых вясельных традыцый і абрадаў, але гэта не значыць, што заключэнне шлюбу ператварылася ў простае святкаванне і ўшанаванне маладых. Сучаснае вяселле таксама мае свае традыцыі, але з-за таго, што наша грамадства сёння з'яўляецца полікультурным і мульцінацыянальным, многія з іх запазычаныя з іншых культур.

Літаратура

1. Никольский, М. Н. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / М. Н. Никольский. – Минск : Изд-во АН БССР, 1956. – 277 с.
2. Гуслева, А. Д. Каравайны абрад / А. Д. Гуслева, Л. Ф. Шамсутдзінава // Беларус. народ. абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск, 1994. – С. 105–126.
3. Малаш, Л. А. Вяселле. Песні ў шасці кнігах / Л. А. Малаш. – Минск : Навука і тэхніка, 1980. – 680 с.
4. Традиции белорусской свадьбы в начале XXI века. – Режим доступа: https://www.gorko.by/svadbaencyclopedia/7839-traditsiibelorusskoysvadbyvnachalexxiveka. – Дата доступа: 05.01.21.

## ФРАЗЕОЛОГИЗМЫ-РЕПРЕЗЕНТАНТЫ ЭМОЦИИ УДИВЛЕНИЯ В БЕЛОРУССКОМ, РУССКОМ И НЕМЕЦКОМ ЯЗЫКАХ

**Е. А. Мигун**

*Учреждение образования «Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины», Республика Беларусь*

Научный руководитель О. А. Лещинская, д-р филол. наук, профессор

Эмоции – особый класс психических процессов, отражающих в форме непосредственного пристрастного переживания значимость жизненных явлений и ситуаций для удовлетворения потребностей человека, для его жизнедеятельности [1, с. 296]. Среди эмоций выделяется эмоция удивления, знакомая каждому, однако ее трудно описать, труднее дать определение, потому что удивление – кратковременное состояние: оно наступает внезапно и так же быстро проходит. В отличие от других эмоций удивление не может длительно мотивировать поведение человека. В толковом словаре лексема *удивление* обозначает «впечатление от чего-н. неожиданного, странного, непонятного» [2, с. 717], т. е. указываются причины возникновения эмоции. В психологии удивление – это психическое состояние, когда что-то кажется странным, необычным, неожиданным [3, с. 372]. Как видно, трудно воспринять и особенно отличить эмоцию удивления от других эмоций человека, поскольку нет четких критерий ее характеристики и отличий.

Наиболее зримо и даже конкретно эмоция удивления находит свое отражение во фразеологии, поскольку абстрактные понятия, в данном случае внутреннее состояние человека, во фразеологизмах передается через конкретные образы. Кроме того, фразеологизмы не столько называют, сколько выражают отношение, дают оценку. Именно эмоции, выражаемые фразеологическими единицами (ФЕ), и стали объектом нашего изучения, при этом в сравнительно-сопоставительном плане, так как эмоция удивления, как и многие другие, характерна для людей разных стран и народов, независимо от их веры, национальной или расовой принадлежности. Стало интересно выяснить, как определяется эмоция удивления у белорусов, русских и немцев. Ведь известно, что протекание эмоции удивления как внутреннего состояния человека у разных людей может отличаться в зависимости от черт характера,